Источник: "Веды" - 2014-04-14

# НОВАЕ ПАКАЛЕННЕ ІНФАРМАЦЫЙНА-БІБЛІЯГРАФІЧНЫХ РЭСУРСАЎ

**Сучасныя бібліяграфічныя рэсурсы ствараюцца і прадстаўлены іх карыстальнікам у электроннай форме. Больш за тое, яны ўсё часцей з'яўляюцца ў анлайн-асяродку. Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Я.Коласа НАН Беларусі (ЦНБ) першая ў краіне прадставіла магчымасць доступу да электроннага каталога (ЭК) (http://libcat.bas-net.by), а пазней – і да галіновых баз звестак ЦНБ.**

Стаў даступным пошук, прагляд і заказ дакументаў у анлайн-рэжыме, што істотна паскорыла і павысіла ўзровень абслугоўвання карыстальнікаў. Акрамя сваіх традыцыйных форм, ЦНБ НАН Беларусі займаецца стварэннем і папулярызацыяй інфармацыйна-бібліяграфічных рэсурсаў па розных галінах навуковых ведаў. Гэту работу ажыццяўляе навукова-бібліяграфічны аддзел (НБА) ЦНБ НАН Беларусі, які працуе з 1952 года. У першыя дзесяцігоддзі сваёй дзейнасці стварэнне бібліяграфічных рэсурсаў было сканцэнтравана вакол тых галін ведаў, якія мелі прыярытэтнае значэнне як для народнай гаспадаркі, так і для фундаментальнай навукі. Пазней, у рамках рэспубліканскай міжбібліятэчнай каардынацыі пафарміраванні бібліяграфіных рэсурсаў, работа ў аддзеле ажыццяўлялася па трох асноўных напрамках: прыродазнаўства, навуказнаўства і беларускае мовазнаўства.



Новае пакаленне інфармацыйных рэсурсаў – электронныя базы звестак – сталі з'яўляцца ў бібліятэцы ў 1990-х гадах. Гэта бібліяграфічныя і абъектаграфічныя базы. Раней бібліяграфічныя дапаможнікі ствараліся ў выглядзе друкаванай кнігі. Цяпер у НБА ЦНБ ёсць 11 тэматычных, політэматычных і праблемна-арыентаваных баз звестак. Агульны аб'ём інфармацыі, што яны генерыруюць, паступова павялічваецца і складае ў агульнай колькасці больш за 146 тыс. запісаў. Гэтыя электронныя рэсурсы з'яўляюцца арганічным дапаўненнем электроннага каталога ЦНБ, матэрыяламі аналітычнага тыпу апісання (артыкулы з перыядычных і тых, што працягваюць выданне, дакументаў, зборнікаў і матэрыялаў канферэнцый, главы манаграфічных выданняў і інш.).

Дзве галіновыя базы звестак выстаўлены для карыстальнікаў у анлайн-рэжыме: «Мовазнаўчая беларусістыка» (http://libcat.bas-net.by/belmova/) і «Экология и природопользование в Беларуси» (http://libcat.bas-net.by/ecology/).

Першая прадстаўляе звесткі аб дакументах па асноўных тэарэтычных напрамках сучаснай мовазнаўчай беларусістыкі: фанетыцы, марфалогіі, сінтаксісе, лексікалогіі, анамастыцы, тэрміналогіі, стылістыцы, дыялекталогіі, кагнітыўнай і функцыянальнай лінгвістыцы, семантыцы, парэміялогіі, фразеалогіі. У ёй адлюстравана таксама інфармацыя аб дакументах па пытаннях моўнай палітыкі, гісторыі і сучаснага стану беларусай мовы, аб дзейнасці беларускіх і замежных моваведаў і рабоце навуковых устаноў у галіне беларускага мовазнаўства.

База звестак «Экология и природопользование в Беларуси» дае інфармацыю аб дакументах па экалогіі, эколага-прававых пытаннях, прыродакарыстанні, ахове прыроды, міжнародным супрацоўніцтве, геалагічнай будове, карысных выкапнях, пра клімат, водныя рэсурсы, глебы, раслінны і жывёльны свет, прыродны ландшафт, антрапагеннае ўзаемадзеянне на навакольнае асяроддзе, вынікі аварыі на ЧАЭС і іншыя надзвычайныя сітуацыі тэхнагеннага і прыроднага характару, а таксама па іншых пытаннях.

Сайт бібліятэкі прадстаўляе як генерыруемыя, так і рэсурсы лакальнага доступу, а таксама інфармацыю аб іх размяшчэнні ў залах абслугоўвання. Сярод генерыруемых рэсурсаў лакальнага доступу можна вызначыць наступныя базы звестак: «Беларускае мовазнаўства» (1986-2010), «Природа Беларуси» (1991-2001), «Наука и научно-исследовательская работа в Беларуси» (1995-2012), «Беларуская навука ў асобах» (1995-цяперашні час), «Научные мероприятия (съезды, конференции, совещания и др.) в Беларуси» (1995-2012).

Бібліяграфічныя крыніцы, у апошні час усё часцей прадстаўленыя ў выглядзе баз звестак, ствараюцца для таго, каб пашырыць працэс выкарыстання інфармацыі па розных пытаннях і ў розных галінах ведаў. Яны дазваляюць знайсці выдадзеныя ў пэўны час публікацыі, а таксама найлепшым чынам захаваць пераемнасць паміж пакаленнямі даследчыкаў.

**Алена КАРАТЫШЭЎСКАЯ**